ГУК «Чаусская библиотечная сеть»
Отдел обслуживания и информации ЦБ

# Читайте классику, друзья!

## Виртуальная выставка



Классическая литература никогда не теряет своей актуальности. Все мы изучали эти произведения в школе, они хорошо всем знакомы и поэтому порой кажутся устаревшими и скучными. А ведь писатели-классики были абсолютно непохожими друг на друга людьми, имели разные судьбы, сложные характеры и великие дарования. Они внесли огромный вклад в развитие литературы, написав такие произведения, которые до сих пор оставляют неизгладимый след в сердцах и душах читателей всего мира. Привлечь внимание к творчеству писателей-классиков, к чтению классической литературы призвана виртуальная выставка «Читайте классику, друзья!».






Достоевский, Ф. М. Преступление и наказание : Роман / Достоевский, Федор Михайлович. — М. : Дрофа : Вече, 2006. — 605с.

Роман Федора Михайловича Достоевского «Преступление и наказание» был вдохновлен жизнью самого писателя: идея произведения зародилась, когда он отбывал наказание на каторге в Омске. Текст, начинавшийся как исповедь,
превратился, по словам автора, в «психологический отчет одного преступления». История студента Раскольникова, посвященная преступлению и раскаянию, трудному моральному выбору и поиску света даже в самые темные времена, стала одной из важнейших книг в мировой литературе и остается актуальной по сей день. «Во всем есть черта, за которую перейти опасно; ибо, раз переступив, воротиться назад невозможно».






Булгаков, М. А Мастер и Маргарита : Роман / Булгаков, Михаил Афанасьевич. — М. : АСТ, 2007. — 446с.

Бессмертное, загадочное и остроумное "Евангелие от Сатаны» Михаила Булгакова. Роман, уникальный в российской литературе XX столетия. Трудно себе представить, какое влияние он оказал на мировую
Культуру. Москва, тридцатые годы прошлого века, май. В день, когда два московских литератора собрались прогуляться по Патриаршим прудам, а красавица-комсомолка уже разлила масло возле трамвайных путей, в Москву в сопровождении свиты прибывает крайне странный гость. одозрительные граждане с ходу опознали бы в нём иностранца, но что, если советскую столицу почтил визитом сам дьявол? На основе "Мастера и Маргариты" снимались и продолжают сниматься фильмы и телесериалы, это произведение легло в основу оперы, симфонии, рок-оперы, его иллюстрировали самые знаменитые художники и фотографы.






Ремарк, Э. М. Три товарища : Роман : Пер.с.нем. / Ремарк, Эрих Мария. — М : ООО"АСТ", 2004. — 380с.

Трое друзей – Робби, отчаянный автогонщик Кестер и "последний романтик" Ленц прошли Первую мировую войну. Вернувшись в гражданскую жизнь, они основали небольшую автомастерскую. И хотя призраки прошлого преследуют их, они не унывают – ведь что может быть лучше дружбы, крепкой и верной, ради которой можно отдать последнее? Наверное, лишь только любовь, не знающая границ и пределов. Прекрасная и грустная Пат, нежная возлюбленная Робби, рассеивает мрак бессмысленности его существования. Однако обретенному счастью угрожают отголоски все той же войны – существующие уже не только в памяти и сознании героев, а суровым образом воплотившиеся в реальность...




Сэлинджер, Джером Д Над пропастью во ржи : Повесть: Пер.с англ. / Сэлинджер Джером Д. — М. : АСТ : Люкс, 2004. — 237с.

«Над пропастью во ржи» — известное всем произведение Дж. Д.Сэлинджера, оставившее неизгладимо яркий след на истории мировой литературы.Книга Дж. Д. Сэлинджера повествует о нескольких днях изжизни американского подростка Холдена Колфилда. Это не просто книга, это гимн каждого подростка, роман, насквозь пропитанный духом бунтарства и авантюризма, отвергающий серый и скучный взрослый мир.Главный герой Холден Колфилд стал предводителем юных мечтателей по всему миру. «Над пропастью во ржи» вошел в мир громким протестом и останется в нашей памяти навсегда.

Возможно, уроки белорусской литературы не были вашими любимыми, и кое-кто из белорусских классиков "прошел мимо". Не беда – рассказываем о произведениях, которые можно (и нужно!) читать в любом возрасте.

Белорусская литература – многогранная и неотъемлемая часть национальной культуры. В ней отражены и индивидуально переосмыслены ход исторических событий и самобытность нашего народа, а благодаря таланту каждого автора произведения получаются действительно уникальными.

Рассказываем о некоторых книгах, на которые стоит обратить
внимание в первую очередь, если вы решили получше познакомиться с белорусским литературным наследием.

И напоминаем: это лишь
фундамент, без которого не обойтись.






Колас, Я. Новая зямля : паэма / Якуб Колас ; [прадмова У. Казберука]. — Мінск : Юнацтва, 1982. — 286 с.

Гэту кнігу многія называюць "энцыклапедыяй беларускага жыцця". Зярно праўды ў гэтым выказванні ёсць. Кніга паслядоўна расказвае аб працы беларуса, яго радасцях, святах, перажываннях і турботах у мінулым стагоддзі. Галоўная праблема мінулага і сучаснага - свая зямля. На самой справе, хто мае ўласную зямлю, таму не трэба баяцца ні эканамічнага крызісу, ні беспрацоўя. А ці з'явіцца ў беларуса права на сваю зямлю? Хто ведае...

Паэма Народнага паэта Беларусі Якуба Коласа "Новая зямля" – першы беларускі буйны эпічны твор. Гэта кніга, якая павінна быць у біблятэцы кожнага, хто лічыць сябе беларусам. Не толькі таму, што гэта першая нацыянальная паэма, якую справядліва лічаць энцыклапедыяй жыцця беларускага сялянства, класічным творам нашай літаратуры, а перад усім таму, што гэта выдатная паэзія. Сам Якуб Колас лічыў яе асноўнай паэмай ва ўсёй сваёй паэтычнай творчасці.






Мележ, І. П. Людзі на балоце : Раман з "Палес.хронікі" / Мележ, І.П. — Мн. : Маст.літ., 1991. — 400с.

Імя Івана Мележа застанецца ў нацыянальнай і сусветнай літаратуры дзякуючы створанай ім эпічнай «Палескай хроніцы» — глыбокаму філасофска-мастацкаму асэнсаванню жыцця Беларусі ў пераломныя 1920—1930-я гады. Раман «Людзі на балоце», які распачынае хроніку, уводзіць чытача ў беларускі свет вёскі Курані, дзе здзяйсняецца драма жыцця і кахання галоўных герояў. Сам Мележ невыпадкова называў свой твор лірычным раманам. Не прачытаўшы «Людзей на балоце», сапраўды немагчыма спасцігнуць душу беларуса, ягоны нацыянальны характар, мары і памкненні.




Баршчэўскі, Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Баршчэўскі Ян. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. — 383с.

Надзелены фенаменальнай фантазіяй і талентам прадбачання, Ян Баршчэўскі стаў адным з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры і ўзбагаціў яе, магчыма, адным з самых загадкавых і займальных твораў – кнігаю "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях", у якой шырока выкарыстаны беларускія народныя казкі, легенды і паданні.

Гэта новае выданне праілюстравана чароўнымі малюнкамі вядомай мастачкі Лізаветы Лянкевіч. На вокладцы яна адлюстравала вобраз затопленай Беларускай Антлантыды. Мы бачым руіны спадчыны на дне возера Нешчарда, роднага возера Яна Баршчэўскага, якое ён з такой любоўю апісвае ў сваім творы. А на дне – героі апавяданняў, якія чакаюць цікаўнага чытача.






Караткевіч, У. С. Чорны замак Альшанскі : раман / Уладзімір Караткевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2024. — 374 с.

«Чорны замак Альшанскі» — класічны беларускі дэтэктыў. У ім, як і ў іншых творах Караткевіча, выяўляецца містычная повязь часу. Нездарма галоўны герой гэтага знакавага для беларускай культуры рамана Антон Космiч кажа: «Хто не памятае мінулага, хто забывае мінулае — асуджаны зноў перажыць яго. Безліч разоў». Для Косміча пошукі скарбаў роду Альшанскіх ператвараюцца не толькі ў цікавую прыгоду, але і ў барацьбу за ўсталяванне праўды і справядлівасці, у якой яму дапамагаюць самыя розныя персанажы: супрацоўнік органаў дзяржаўнай бяспекі, святы айцец, вартаўнік замка і касцёла, кіраўнік археалагічнай экспедыцыі. Гэта адзін з найвядомейшых твораў Уладзіміра Караткевіча.




Быкаў, В. У. Альпійская балада / Васіль Быкаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2007. — 333 с.

Васіль Быкаў — імя, вядомае ўва ўсім свеце. Ягоная праўда пра вайну заўсёды не проста ўражвала, яна — апякала. Ягоная глыбіня спасціжэння ўзлётаў і падзенняў чалавечае натуры ў нашай літаратуры не мае сабе роўных. У кнігу Народнага пісьменніка Беларусі ўвайшлі аповесці «Альпійская балада» і «Пакахай мяне, салдацік», у якіх закранаецца тэма вайны.




Адамовіч, А. Хатынская аповесць / Алесь Адамовіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. — 237 с.

У «Хатынскай аповесці» (1970) беларускі празаік, здаецца, свядома ўступае ў адкрытае спаборніцтва з гістарычнымі дакументамі і ўспамінамі відавочцаў і ахвяраў страшных ваенных злачынстваў, дэманструючы здольнасць літаратурнага слова перадаваць эмацыянальны напал падзей часу вайны, невыносны боль беларускіх жанчын і дзяцей, якія перажылі ўласную пагібель і намагаюцца адшукаць словы, адэкватныя перажытаму імі.




Купала, Я. Тутэйшыя : Трагічна-смяшлівыя сцэны ў 4-х дзеях / Купала,Янка. — Мн : Маст.літ., 2004. — 93с.

Трагікамедыя “Тутэйшыя” (1922) – апошняя па часе насісання п’еса Янкі Купалы. Дыялогі, мізансцэны, драматургічны канфлікт знікнуць з ягонай творчасці, як толькі новая ява – савецкая – запануе ў Беларусі. Вось такую суму змагарскага, палітычнага і паэтычнага досведу, плёну мараў і расчараванняў, пакутлівых роздумаў пра сучаснасць і будучыню Бацькаўшчыны рэалізоўваў Купала ў абагульняльным творы – “Тутэйшыя”.




Чорны, К. Пошукі будучыні : Раман, аповесці, апавяданні / Чорны,Кузьма. — Мн : Маст.літ., 2008. — 421с.

Гэта адзін з апошніх класічных раманаў Кузьмы Чорнага і ў той жа час першы раман пісьменніка, напісаны ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у якім яскрава праявіўся талент празаіка. У Кузьмы Чорнага атрымалася адлюстраваць беларускую гісторыю ў яе пераломныя моманты.

Раман «Пошукі будучыні» мае сацыяльна-філасофскі змест. З аднаго боку, у ім Кузьма Чорны падняў важныя сацыяльныя пытанні: войны, цыклічнасць гісторыі, неспрыяльныя ўмовы для жыцця беларусаў, пакуты і вымушанае ранняе сталенне дзяцей.

Пісьменніка хвалявала жыццё звычайнага беларуса, на долю якога выпала шмат выпрабаванняў.

